ПАДМУРАК

# ГРАМАДСКАЙ СВЯДОМАСЦІ

Выхаванне грамадзяніна мае на ўвазе неабходнасць педагагічнай работы па фарміраванню ў дзіцяці маральна-прававой сталасці як складанага сацыяльна-псіхалагічнага ўтварэння, якое развіваецца ў працэсе ўсведамлення асобай маральна-прававых норм грамадства і праяўляецца ва ўменні кіравацца ў сваіх паводзінах матывамі абавязку, адказнасці, справядлівасці, сумлення.

У школьным узросце маральна-прававая сталасць толькі пачынае фарміравацца. Гэта працэс, у ходзе якога школе даводзіцца вырашаць цэлы шэраг праблем, звязаных з развіццём асобы вучня. Маральны пачатак складае ядро чалавечай асобы, таму што ён выступае фактарам, які звязвае духоўны і эмацыянальны свет чалавека ў адзінае цэлае. Якім бы ні быў чалавек развітым фізічна і інтэлектуальна, якім бы ні быў ён адукаваным у прававых адносінах, ён не з'яўляецца паўнацэннай асобай, калі не валодае пры гэтым развітой маральнай свядомасцю. Маральны пачатак у чалавеку вызначае яго адносіны як асобы і грамадзяніна да законаў, рэчаіснасці, іншых людзей, самога сябе, што мае на ўвазе пэўныя мэты і межы паводзін.

Педагагічная навука заўсёды больш увагі ўдзяляла пытанням маральна-прававога выхавання школьнікаў старэйшага падлеткавага ўзросту. Прычына гэтага заключалася ў тым, што, згодна з нашым заканадаўствам толькі з 14 гадоў для падлеткаў настае абмежаваная крымінальная адказнасць і толькі ў 16 гадоў школьнік атрымлівае працоўныя, грамадзянскія правы і пасведчанне аб гэтым — пашпарт. Аднак да 14 — 16 гадоў у падлеткаў ужо могуць назапасіцца дэфекты маральнага выхавання, чаму сёння спрыяе дэвальвацыя многіх каштоўнасцей, у тым ліку і сацыяльна-прававых.

Практыка паказвае, што засваенне прававых ведаў у раннім школьным узросце можа спрыяць выпрацоўцы маральнай пазіцыі вучня. Таму ў апошні час у навуковай літаратуры, у друку з'яўляецца ўсё больш публікацый, аўтары якіх выступаюць за неабходнасць увядзення асноў прававой граматы ўжо ў пачатковых класах.

Малодшы школьны ўзрост надзвычай важны для маральна-прававога сталення асобы, бо менавіта ў гэты час дзіця пачынае глыбока і дастаткова сур'ёзна пазнаваць пэўнае сацыяльнае асяроддзе і ў яго ўзнікае патрэбнасць ацаніць многія з'явы навакольнага свету.

Малодшы школьны ўзрост, зразумела, патрабуе своеасаблівага падыходу ў ажыццяўленні маральна-прававога выхавання.

Па-першае, у гэтым узросце ў вучняў ужо ёсць інтэлектуальныя магчымасці для засваення і выкарыстання агульных і спецыяльных правіл паводзін. Узрастае здольнасць дзіцяці да прапановы гіпотэз, класіфікацыі аб'ектаў і да пабудовы вывадаў, а ў выніку — і да рашэння праблемных сітуацый. Гэта вельмі важна ў засваенні маральных і прававых норм, бо ў жыццёвых сітуацыях яны цесна пераплятаюцца.

Па-другое, малодшы школьнік ужо мае дастаткова дакладныя ўяўленні аб добрых і дрэнных паводзінах і вызначае ўласныя стандарты паводзін. Аднак гэтыя ўяўленні грунтуюцца на працэсе ідэнтыфікацыі. Таму асаблівасці маральна-прававога выхавання ў малодшым школьным узросце ў значнай ступені залежаць ад прыроды ўзаемаадносін і ўзаемадзеяння дзіцяці з дарослымі. Малыш прымае маральныя і прававыя нормы паводзін сваіх бацькоў, прычым не на вербальным узроўні — менавіта самі паводзіны бацькоў і з'яўляюцца мадэллю для пераймання. Калі бацькоў не клапоцяць праблемы сумленнасці, то малаверагодна, што дзіця будзе надаваць вялікае значэнне гэтай якасці.

З прыходам у школу пашыраюцца сацыяльныя сувязі дзіцяці. Цяпер ужо асоба настаўніка адыгрывае немалаважную ролю ў маральна-прававым выхаванні. Задача школьнага выхавання і навучання заключаецца ў тым, каб даць вучню ўзоры (эталоны) культуры, у тым ліку і нормы паводзін. Прыняцце малодшым школьнікам новых стандартаў паводзін найбольш верагоднае ў тых выпадках, калі паміж настаўнікам і вучнем усталёўваецца ўзаемаразуменне. Заахвочванні, добразычлівыя адносіны да дзіцяці — асноўныя ўмовы поспеху ў яго выхаванні.

Па-трэцяе, у гэтым узросце сяброўскія адносіны становяцца больш інтэнсіўнымі, хаця многія з іх аказваюцца вельмі нетрывалымі. З прыходам у школу значна павялічваецца групавая ідэнтыфікацыя з равеснікамі. Гэта ўзрост найбольш выражанай канформнасці: віды дзейнасці, манера размовы, адзенне ўсё больш пачынаюць залежаць ад норм, што ўсталяваліся ў класе. Малодшы школьнік умее заводзіць сяброў і знаходзіць агульную мову з неаднароднай групай дзяцей. Такім чынам, у пачатковай школе ствараюцца перадумовы для фарміравання пэўных навыкаў і вопыту маральна-прававых адносін.

Па-чацвёртае, на працягу гэтага перыяду дзяцінства ў школьнікаў развіваюцца больш адэкватныя ўяўленні аб сваіх эмоцыях. Яны ўжо пачынаюць набываць вопыт кіравання эмацыянальнымі станамі. Аднак ёсць дзеці, якія ў першыя месяцы навучання ў школе так моцна хвалююцца, што могуць адказваць ля дошкі толькі шэптам. Яны адчуваюць трывогу, звязаную з наведваннем школы, часцей за ўсё з-за боязі расстацца з маці або з-за нейкіх першых няпоспехаў у вучобе. У большасці выпадкаў падобная рэакцыя часовая. Важна стварыць у класе сітуацыю эмацыянальнага камфорту для дзіцяці: заахвоціць, адобрыць, парадавацца яго поспеху. З цягам часу, вывучыўшы правілы паводзін у школе, дзеці пачынаюць усведамляць змяненне свайго сацыяльнага статусу, які мае на ўвазе пэўныя межы паводзін, і прывыкаць да новай ролі — ролі вучня.

Эмацыянальная ўспрымальнасць малодшага школьніка — спрыяльная ўмова эфектыўнасці маральна-прававога выхавання. Настаўнік павінен ведаць, што прававыя веды могуць садзейнічаць маральна-прававому выхаванню ў тым выпадку, калі яны будуць закранаць пачуццёвую сферу свядомасці школьніка.

Першы пачуццёвы імпульс, некіруемыя свядомасцю эмоцыі могуць стаць прычынай асацыяльнага ўчынку малодшага школьніка. Педагогу важна арыентаваць вучня на тое, каб ён падпарадкоўваў пачуцці, першыя эмацыянальныя імпульсы патрабаванням розуму, і на тое, каб ён развіваў неабходныя эмоцыі.

Вялікую ўвагу неабходна ўдзяляць узбагачэнню малодшых школьнікаў маральна-прававымі ведамі. З першых дзён наведвання школы дзяцей варта азнаёміць з асноўнымі правіламі паводзін на ўроку і ў школе, з правамі і абавязкамі вучня.

Пажадана, каб малодшыя школьнікі засвоілі такія маральна-прававыя паняцці, як «правы», «абавязкі», «гонар», «сумленне» і г. д.

Няблага было б нам пераняць вопыт Японіі, дзе гістарычна склалася так, што побач з разумовым развіццём дзяцей вялікая ўвага ўдзяляецца засваенню імі маральна-этычных прадпісанняў і настаўленняў. Там школьнік абавязкова павінен засвоіць такія нормы, як глыбокая пашана, удзячнасць у адносінах да бацькоў, поўнае прыняцце на сябе клопатаў аб іх у старасці. Важнымі прадпісаннямі з'яўляюцца таксама лаяльнасць да групы, прэваліраванне групавых інтарэсаў над асабістымі. Вядома, гэтыя маральна-этычныя нормы з'яўляюцца сацыяльна пажаданымі для многіх краін, але ў Японіі ім надаюць асаблівае значэнне, паколькі традыцыйна лічыцца: толькі чалавек, які выконвае іх, можа забяспечыць мір і працвітанне краіне і спакой у сям'і.

Выхаванне грамадзяніна немагчыма без выпрацоўкі ў дзяцей звычкі кіравацца ў жыцці маральна-прававымі нормамі. Толькі арганічнае спалучэнне маральна-прававой асветы з прывучэннем да выканання норм паводзін можа даць станоўчыя вынікі ў выхаванні. Таму важнай часткай работы настаўніка пачатковых класаў з'яўляецца фарміраванне ў вучняў навыкаў культуры паводзін. І поспех тут у многім залежыць ад правільнага выбару форм і метадаў работы. Спынюся на тых з іх, якія, на мой погляд, найбольш адпавядаюць задачам маральна-прававога выхавання малодшых школьнікаў.

Аналіз псіхолага-педагагічнай літаратуры, вопыту выхаваўчай работы ў школах паказвае, што найбольш эфектыўнымі ў гэтым узросце з'яўляюцца эстэтычныя сродкі выхавання. Праз перажыванне цудоўнага і агіднага, узвышанага і ганебнага, трагічнага і камічнага ў музыцы, выяўленчым мастацтве, кіно, тэатры фарміруюцца маральныя якасці асобы і матывы яе паводзін.

З мэтай выпрацоўкі навыкаў культуры паводзін можна наладжваць разнастайныя ролевыя гульні. Напрыклад, у класе арганізуецца «тэатр», у якім ёсць «гардэроб», «каса», «білецёр», некалькі радоў крэслаў, «праграма спектакля». Наладжваецца невялікае выступленне «артыстаў» і г. д. У час гульні дзеці выконваюць пэўныя дзеянні: купляюць білеты, распранаюцца «ў гардэробе», правільна праходзяць між радамі на свае месца, апладзіруюць «артыстам», выходзяць у «фае» ў час «антракту» і г. д. Выкананне розных роляў дапамагае школьнікам больш глыбока ўнікаць у сутнасць правіл паводзін і адпрацоўваць адпаведныя навыкі.

Маральна-прававому выхаванню малодшых школьнікаў могуць спрыяць сітуацыі (натуральныя або створаныя спецыяльна), у якіх вучань ставіцца ў пазіцыю маральнага выбару, г. зн. мае рэальную магчымасць для прымянення на практыцы ведання норм паводзін.

Так, у адной са школ абмяркоўваўся выпадак, які здарыўся з двума вучнямі чацвёртых класаў. Год назад аднаму з іх — Пецю — падарылі чарапаху. Ён быў рады падарунку, старанна даглядаў жывёлу, выносіў на вуліцу пагуляць. У адну з такіх прагулак чарапаха згубілася. Хлопчык вельмі перажываў гэтую страту. Прайшоў амаль год. Аднойчы ў двары Пеця ўбачыў сваю чарапаху на руках у хлопчыка з суседняга класа. Ён падышоў да Лёні (так звалі другога хлопчыка) і запатрабаваў вярнуць сваю ўласнасць. Але Лёня абурыўся і сказаў, што ён даглядае чарапаху амаль год і яна прывыкла да яго. Пачалася спрэчка, а затым адбылася бойка. Як вырашыць праблему? Каму павінна належаць чарапаха?

На класнай гадзіне два класы спрабавалі вырашыць гэтую праблему. Абмеркаванне пачалося з таго, што настаўнік пагутарыў са школьнікамі аб немагчымасці вырашэння спрэчак з дапамогай сілы і прапанаваў паспрабаваць вырашыць гэтае пытанне мірным шляхам.

Было шмат прапаноў, утварыліся дзве асноўныя групы: «прыхільнікаў Пеці» і «прыхільнікаў Лёні». Нягледзячы на тое што з пачатку абмеркавання прайшло шмат часу, было шмат сказана і выслухана нямала аргументаў, да адзінай думкі дзеці так і не прыйшлі. Выказваліся нават такія прапановы: аддаць чарапаху каму-небудзь трэцяму; няхай чарапаха пажыве адзін месяц у Пеці, а адзін — у Лёні; арганізаваць «жывы куток» і пакінуць яе ў школе (на апошнюю прапанову многія дзеці абурыліся: «шкада чарапаху, тут яна можа памерці»).

Тады настаўнік прапанаваў хлопчыкам самім расказаць пра сваю чарапаху, пра яе характар і звычкі. Дзеці выслухалі Пецю і Лёню. Было відавочна, што Лёня лепш ведае сваю падапечную, любіць яе і даглядае яе больш старанна, чым гэта рабіў Пеця (ва ўсякім разе не пакідае яе адну на вуліцы). Зразумеў гэта і Пеця. Хаця ён і перажываў, але сам адмовіўся ад чарапахі на карысць Лёні. Сітуацыя вырашылася, а праз два тыдні Лёня падарыў Пецю папугая. Хлопчыкі сталі сябрамі.

Выкарыстанне гэтай дастаткова складанай сітуацыі, акрамя відавочных вынікаў (вырашэнне спрэчкі, набыццё ведаў аб маральных і прававых нормах, уменняў і навыкаў вырашэння спрэчкі), дапамагло вучням навучыцца адрозніваць патрабаванне права і патрабаванне маралі.

Такім чынам, умела наладжаная работа па маральна-прававому выхаванню малодшых школьнікаў паспрыяе паступоваму назапашванню дзецьмі вопыту маральных адносін і выхаванню ў іх такіх якасцей, без якіх немагчыма фарміраванне грамадскай свядомасці ў больш старэйшым узросце.

**І. А. ЦАРЫК,**
**навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі Рэспублікі Беларусь.**